Правильно, грамотно составить текст документа может каждый. Однако этому нужно учиться, оттачивать свои навыки на практике, и тогда ваш документ будет лаконичным, точным, правильным в юридическом отношении.

Языковые средства, которые используются в деловой коммуникации, многообразны, они фиксируют и передают различную информацию (юридическую, производственную, экономическую, управленческую и под.) и поэтому требуют от участников этого процесса определенных знаний языка и о языке.

По мнению великого Конфуция: «Мудрый правитель первым делом должен называть вещи правильными именами. Ведь если вещи будут именоваться неправильно, слова потеряют силу и ни одно дело нельзя будет довести до конца».

УДК 821.161.3

# ГЕНІЙ НАВАГРУДСКАЙ ЗЯМЛІ (ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ АДАМА МІЦКЕВІЧА)

*Студэнты – Патук В.М., 20 эт, 1 курс, АЭФ;*
*Лакуця С.М., 5 мот, 2 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Фокіна І.С., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца асноўныя этапы жыцця і творчасці вядомага беларуска-польскага паэта, публіцыста і грамадскага дзеяча Адама Міцкевіча.

**Ключавыя словы:** літаратура, паэзія, вусна-паэтычная творчасць, фальклор.

**Біяграфія**



Адам Бернард Міцкевіч нарадзіўся 24 снежня 1778 г. у г. Навагрудак на тэрыторыі, якую ў той час называлі Літвой, і заўсёды лічыў Літву сваёй радзімай. Ён скончыў Віленскі ўніверсітэт, а затым працаваў настаўнікам у школе г. Коўна (зараз г. Каўнас). Міцкевіч быў адным з заснавальнікаў і актыўным дзеячам тайнага Патрыятычнага таварыства філаматаў, за што разам з групай аднадумцаў быў арыштаваны і заключаны ў Віленскую турму, якая размяшчалася ў памяшканні былога Базыльянскага манастыра (1823–1824). У 1829 г. ён адправіўся ў падарожжа па Еўропе.

**Парыжскі перыяд**

Жыццё паэта ў Парыжы было цяжкім. На працягу некалькіх гадоў Міцкевіч ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, супрацоўнічаў з Літаратурнай супольнасцю і Нацыянальным польскім таварыствам. У 1833 г. быў рэдактарам і публіцыстам часопіса «Pielgrzym Polski». У 1834 г. ён ажаніўся з Цалінай Шымаоўскай, у шлюбе з якой у яго нарадзілася шасцёра дзяцей. Міцкевіч адышоў ад грамадскай дзейнасці аж да 1840 г., калі яго запрасілі ўзначаліць новую кафедру славянскіх літаратур у Калеж дэ Франс. Разам з Жулем Мішле і Эдгарам Кінэ ў гэтай навучальнай установе яны ўяўлялі сабой дэмакратычную апазіцыю ліпеньскай манархіі.

Падчас знаходжання ў Рыме ў 1848 г. Міцкевіч стварыў польскі легіён, які змагаўся за свабоду Ламбардыі. Яго мэты і праграму ён выклаў у тэксце «Звод прынцыпаў». Затым разам з групай французаў і эмігрантаў ён заснаваў выданне «La Tribune des Peuples» з радыкальнай грамадскай праграмай. У выніку ўмяшання рускага пасольства выданне было закрыта, а Міцкевіч пасля перавароту ў 1851 г. знаходзіўся пад наглядам паліцыі. Апошняй патрыятычнай акцыяй паэта стала спроба фармавання польскіх легіёнаў для барацьбы з Расіяй пасля ўступлення Францыі ў крымскую вайну. З гэтай мэтай ён прыбыў у Стамбул ў верасні 1855 г., дзе нечакана памёр. Ён быў пахаваны ў Францыі на польскай могілках у Манмарансі. У 1900 г. прах Міцкевіча быў урачыста перавезены ў Польшчу і змешчаны ў саркафаг у Вавельскім кафедральным саборы.

**Творчасць**

Міцкевіч пакінуў вялікую і разнастайную літаратурную спадчыну, якая ўключае лірыку, эпічныя паэмы, драмы, публіцыстыку, мноства фрагментаў няскончаных твораў. Пасля першых вершаў, напісаных у духу класіцыстычная, ён выдаў зборнік «Паэзія» том I (1822), які паклаў пачатак польскага рамантызму. У «Прадмове» і баладзе «Рамантыка» Міцкевіч сфармуляваў новую літаратурную праграму, якая адсылала да народных вераванняў, міру пачуццяў і фантазіі.

У другім томе «Паэзіі» (1823) выйшлі паэма «Дзяды», а таксама гістарычная паэма «Гражына. Літоўская аповесць».

У 1829 г. пасля падарожжа па Расіі Міцкевіч апублікаваў свае «Санеты».

У Дрэздэне Міцкевіч напісаў трэцюю частку «Дзядоў».

У Парыжы Міцкевіч напісаў і апублікаваў, мабыць, найважнейшы свой твор «Пан Тадэвуш, або Апошні наезд на Літве. Шляхецкая гісторыя 1811–1812 гг. у дванаццаці кнігах, пісаная вершамі» (1834).

Творчая спадчына беларуска-польскага паэта Адама Міцкевіча вылучаецца сваёй арганічнай знітаванасцю з вусна-паэтычнымі ўяўленнямі беларускага народа. Народныя паданні, вераванні з'яўляліся той першакрыніцай, што надавала творам Адама Міцкевіча жыватворную сілу. На думку польскага паэта Станіслава Дабравольскага, калі «ён шукаў крыніцы натхнення для сваіх народных песень, для сваёй цудоўнай паэзіі, ён заўсёды

шукаў гэтыя крыніцы якраз у беларускай народнай песні... і кожнаму, безумоўна, ясна, што без беларускай народнай песні, без народнай паэзіі беларусаў не было б многіх балад А. Міцкевіча, а калі б яны і з'явіліся, то мелі б іншы характар». Такой думкі прытрымліваецца і беларускі літаратуразнаўца, паэт Алег Лойка, адзначаючы, што «сувязь Адама Міцкевіча з вуснай паэтычнай творчасцю народа была адным з рашаючых фактараў, якія вызначылі моц Міцкевіча – мысліцеля і арыгінальнага мастака слова».

Большасць баладаў А. Міцкевіча з'яўляецца вынікам творчага пераасэнсавання беларускіх фальклорных матэрыялаў, паэтычнай апрацоўкай народных вераванняў, уяўленняў, паданняў Наваградчыны, тых мясцінаў, дзе прайшлі дзіцячыя гады паэта.

«Свіцязянка» – адна з трох балад Адама Міцкевіча, прысвечаных аўтарам возеру Свіцязь, што на Наваградчыне. Перапрацаваўшы шматлікія павер'і і паданні, Міцкевіч стварыў глыбока патрыятычны твор, у якім раскрываецца любоў да свайго роднага краю, самаадданая барацьба супраць ворага, бессмяротнасць подзвігу ў імя жыцця сваёй Бацькаўшчыны. Пісьменнік паказаў, што сіла народа неўміручая, ворагу няма месца на захопленай зямлі. Балада «Свіцязянка» закранае не менш важную праблему ў жыцці чалавека – вернасць. Той, хто адданы свайму каханню, адданы і сваёй радзіме. Менавіта на матыве віны і пакарання пабудаваны дадзены твор А. Міцкевіча.

Творчасць Міцкевіча аказала значны ўплыў на беларускую культуру: на грамадскую свядомасць, літаратуру і мастацтва. На працягу двух стагоддзяў яна была пастаянным элементам літаратурнай адукацыі і патрыятычнага выхавання. Яго паэзія аказала ўплыў на мову і свядомасць, адбілася нават у гутарковай мове. Літаратура XIX і XX стст. поўная метафар, цытат і алюзій на творы Міцкевіча. Творчасць Міцкевіча з'ўлялася крыніцай натхнення таксама для жывапісцаў і графікаў, кампазітараў. Сам Міцкевіч як сімвал паэта-прарока стаў тэмай шматлікіх партрэтаў, малюнкаў, медальёнаў і скульптур.

УДК 947.6

## ВІЦЕБСК – ГОРАД МАІХ ПРОДКАЎ, МОЙ ГОРАД

*Студэнты – Чабан М.А., 6 ап, 1 курс, ІТФ;*
*Дамасканаў А.Ю., 5 мот, 2 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Фокіна І.С., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** Цікавасць да сваёй малой радзімы, да свайго горада – аснова глыбокай любові да Радзімы ў цэлым. Ведаць, паважаць і шанаваць сваю гісторыю – гэта значыць, захаваць яе для наступных пакаленняў.